Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 19 (297) | СЕРАДА 3 ліпеня 1957 г. | Цана 20 кап.

У ДОБРЫ ШЛЯХ, ДАРАГІЯ ВЫПУСКНІКІ!

Вы заканчваеце універсітэт у вельмі цікавы час, калі чалавечы розум дасягнуў найвялікшых цудоўных поспехаў у многіх галінах. У гэтым годзе вучоныя і інжынеры нашай краіны запусцяць штучны спадарожнік зямлі. Не за гарамі вырашэнне праблемы міжпланетных зносін. Велічны размах набывае выкарыстанне атамнай энергіі. Паявіліся і удасканальваюцца вылічальныя машыны, якія вырашаюць незвычайна працаёмкія задачы.

Хочацца усім вам пажадаць паспяховай, плённай працы у імя далейшага прагрэсу. Вашы настаўнікі упэўнены, што вы будзеце даражыць гонарам універсітэта і выканаеце усе задачы, якія паставіла перад вамі наша цудоўная Радзіма, наш вялікі народ, наша мудрая Камуністычная партыя.

Д. А. СУПРУНЕНКА,
прафесар, дэкан фізіка-матэматычнага факультэта.

◆ ◆ ◆

Закончылася нялёгкая, але па свойму прыгожая пара вашай вузаускай вучобы. Вы ўступаеце на шлях вялікай самастойнай працы.

Большасці з вас выпаў гонар працаваць на пачэснай ніве настаўніка, выхавацеля падрастаючага пакалення. Не забывайце ніколі, якая вялікая адказнасць ускладзецца на вас гэтым, як многа патрабуецца ад вас, каб дзеці прызналі вас сваім сапраўдным выхавацелем і сябрам.

Не замыкайцеся у вузкім кругу чыста вытворчых інтарэсаў. Совецкі чалавек, тым больш выкладчык, не можа заставацца у баку ад грамадскага жыцця, ад глыбокіх, рознастайных задач комуністычнага будаўніцтва.

Не забывайце універсітэта, вашай факультэцкай сям'і, таварышоу, з якімі прайшлі шлях студэнцкага жыцця. Не парывайце сувязі з намі, вашымі былымі выкладчыкамі, заусёды гатовымі прыйсці вам на дапамогу практычнай парадай.

Будзьце шчаслівы у асабістым жыцці і у працы, захоўвайце маладую свежасць пачуццяў і смелых парываў!

Не бывайце, а — да пабачэння, таварышы!

Л. М. ШНЕЕРСОН,
сакратар партыйнага бюро гістарычнага факультэта.

◆ ◆ ◆

Шырокая дарога адкрылася маладому спецыялісту геаграфу-педагогу і даследчыку, геолагу-разведчыку. Кожнаму з іх прыдзецца вырашаць на сваім жыццёвым шляху цікавыя, важныя, і разам з тым складаныя задачы на карысць народу і любімай Радзіме. Адны будуць імкнуцца пракласці новыя шляхі для развіцця розных галін народнай гаспадаркі, другія выхоўваць новае пакаленне моладзі, дастойнае ва ўсю шыр развярнуць будаўніцтва комунізма ў нашай краіне.

У гэтыя дні хочацца пажадаць нашым пітомцам-выпускнікам шчасця і поспеху у іх прадстаячай рабоце. Выкладчыкі факультэта упэўнены, што вы, нашы вучні, з гонарам пранясеце праз жыццё званне совецкага спецыяліста.

Бесперапынна павышайце сваё майстэрства у працэсе практычнай працы. Будзьце патрабавальнымі да сабе і скромнымі у абыходжанні з іншымі. Будзьце вернымі вялікім запаветам В. І. Леніна, і, як дзеці сваей любімай Радзімы, змагайцеся за мір ва усім свеце, за шчасце усіх людзей. Ваша чэсць, вашы поспехі, будуць гонарам і поспехамі нашага Беларускага універсітэта.

В. ДЗЕМЕНЦЬЕЎ,
загадчык кафедрай фізічнай геаграфіі.

◆ ◆ ◆

Вы бязмерна шчаслівы, што на попрышча самастойнай творчай працы ўступаеце ў святочным бляску саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай социялістычнай рэволюцыі. Не забывайце-ж ніколі, якой дарагой цаной дасягнута гэтае ваша шчасце і беражыце яго. Памятайце і тое, што вам прадстаіць удзельнічаць у ажыццяўленні яшчэ больш грандыёзных задач, пастаўленых нашай слаўнай Комуністычнай партыяй у галіне будаўніцтва комунізма. Але вялікія справы патрабуюць плённай працы, працы як подзвига, працы як рэволюцыйнай страсці.

Не чурайцеся ніякай працы, не пужайцеся ніякіх цяжкасцей. Працуйце не шкадуючы сіл, каб з кожным днём наша Радзіма станавілася усё больш магутнай і моцнай, каб раслі і прыгажэлі нашы гарады, каб багатымі нівамі красаваліся нашы палі, каб яшчэ ярчэй расквітнела наша социялістычная культура, і на багатай глебе распускаліся дзівосныя кветкі розуму, таленту, творчасці.

Самаддана змагайцеся за ператварэнне у жыццё вялікіх ідэй марксізма—ленінізма!

Ф. ШМЫГАЎ,
дацэнт, загадчык кафедрай гісторыі КПСС.

◆ ◆ ◆

Жыццё ідзе ўперад і ставіць новыя пытанні. Прававая навука не стаіць на месцы і працягвае развівацца. Каб быць добрым юрыстам, трэба няспынна паглыбляць свае веды сачыць за развіццём юрыдычнай думкі. Не забывайце мудрую прыказку: «Веды, якія не папаўняюцца, памяншаюцца з кожным днём».

У добры шлях, дарагія таварышы, — на ніву практычнай дзейнасці! Працуйце і працягвайце вучыцца. Не губляйце сувязі з намі, хто даў вам пуцёўку у жыццё.

М. МЕРКУШАЎ, дацэнт,
дэкан юрыдычнага факультэта.

МЫ ЕДЗЕМ НА ЦАЛІНУ, А ВЫ?

— У мінулым годзе я працавала у соугасе імя Фрунзе. Зараз, калі ЦК комсамола зноў кліча комсамольцаў і моладзь на уборку цаліннага ураджаю, 20 студэнтаў нашага 3-га курса гістарычнага факультэта падалі заявы у камітэт комсамола універсітэта з просьбай накіраваць іх у Казахстан. Як комсамолка, я не магу стаяць у баку ад гэтай вялікай падзеі і другі раз еду на цаліну. І мне вельмі хочацца сказаць студэнткам іншых курсаў: «Дзяўчаты, едземце разам на цалінныя землі!»

Ліля МАЛІНОЎСКАЯ,
студэнтка 3-га курса гістфака.

На хімічным факультэце ішоу мітынг прысвечаны абмеркаванню звароту ЦК ВЛКСМ да комсамольцаў і моладзі. Я не хацеу выступаць, але не вытрымаў, падняуся і ад шчырага сэрца заклікаў студэнтаў паехаць на ўборку цаліннага ураджаю. Я-ж еду у другі раз.

Фама МАЖЭЙКА,
студэнт III курса хімфака.

В. Качкоу і В. Гніламёдау рашылі у гэтым годзе зноу паехаць на уборку цаліннага ураджаю.

— Пішам заяву,—кажа Уладзімір Качкоу свайму сябру.

— Пішам,—адказвае Васіль Гніламёдау.

— Здам апошні экзамен па матэматыцы — і шлях на цаліну свабодны! Папрацую так, каб не сорамна было вярнуцца назад.

Іван МАНАК,
студэнт II курса фізмата.

Шчаслівага Вам адпачынку, наш дарагі СЯБРА І НАСТАЎНІК

Гэта быў незвычайны вечар... Сябры і вучні Г. С. Окулава сабраліся, каб ва урачыстай абстаноуцы праводзіць на пенсію любімага выкладчыка.

Яны прыпіл задоўга да пачатку вечара. Мала сказаць, што на вечар ішлі, на яго спяшаліся. Ва аўдыторыю уваходзяць пяцікурснікі-журналісты, група студэнтаў-завочнікаў, у якіх толькі сёння, некалькі гадзін назад прымаў апошні экзамен Гаўрыл Сяргеевіч Окулаў, яго калегі. У 30 аудыторыі ўжо няма дзе размясціцца, а жадаючыя прысутнічаць на гэтым вечары усё прыходзяць і прыходзяць. Гэта выхаванцы Гаўрыіла Сяргеевіча — Саша Зінін і Валя Окунькова, Владзімір Матвееу і Ілья Масткоў—супрацоунікі «Знамени юности», Дзмітры Маркоука, Владзімір Нікамкін, Раіса Самусенкава, Елена Владзіміраваа — супрацоўнікі «Чырвонай змены», Георгі Сіняковіч — галоўны рэдактар таварыства па распаусюджванню палітычных і навуковых ведаў, Ніна Еусцігнева — з «Фізкультурніка Беларусі» і Юрый Ермалюк з газеты «Во славу Родины». Рэдактар Халопеніцкай раённай газеты Аркадзь Качароускі, рэдактар Лідскай раённай газеты т. Гарэлік прыехалі спецыяльна, каб павіншаваць свайго лепшага настаўніка і сябра. Усіх прысутных пералічыць нельга.

... 20 год журналісцкай дзейнасці і 22 гады—педагагічнай — такі вынік слаўнага жыцця старэйшага выкладчыка кафедры тэоры і практыкі партыйнага і совецкага друку Г.С. Окулава.

Старэйшы комуніст-педагог, газетчык-праудзіст, ён усё сваё жыццё прысвяціў выхаванню маладых кадрау журналістау. Г. С. Окулау — арганізатар кафедр тэоры і практыкі партыйнага і совецкага друку у Казахскім і Беларускім універсітэтах. І зараз мы разам з Гаурылам Сяргеевічам ганарымся тым, што яго выхаванцы — журналісты працуюць ва ўсіх кутках Казахстана, Беларусі і іншых рэспублік.

Беражна захоўвае Гаўрыл Сяргеевіч шматлікія дакументы 20—30 гадоу: пажоўклыя квітанцыі аб уплаце членскіх партыйных узносаў, цісьмовае растлумачэнне аб карэспандэнцкіх правах і абавязках таго часу, і як самую дарагую рэліквію, захоўвае пасведчанне пастаяннага карэспандэнта «Правды» па Варонежскай губерні, падпісанае сястрой Владзіміра Ільіча Леніна Марыяй Ільінічнай Ульянавай. Звыш дзесяці год Гаурыл Сяргеевіч Окулау працаваў у «Правде»—быў яе карэспандэнтам і работнікам апарата.

Слаўныя традыцыі большэвіцкага партыйнага друку Г. С. Окулау перадау сваім вучням, тым, хто прысвяціў сябе журналісцкай дзейнасці. Ён перадаваў ім усе свае глыбокія веды, увесь свой вялікі вопыт.

Не забылися аб Гаўрыіле Сяргеевічу і ў Казахстане. З далёкай Алма-Аты вучань і выхаванец Г. С. Окулава, цяпер загадчык кафедры журналістыкі Казахскага універсітэта Бекхажын прыслау у гэты дзень тэлеграму: «З пачуццём глыбокай прызнальнасці успамінаюць вас выхаванцы і калектыу аддзялення журналістыкі Казахскага універсітэта, вашу самаадданую працу па выхаванню маладых журналістаў. Сардэчна вітаем вас і ад душы жадаем вам, дарагі Гаўрыл Сяргеевіч, добрага здароуя, доўгіх год жыцця, заслужанага адпачынку».

Адрас ад калектыву выкладчыкаў і студэнтау універсітэта зачытвае Н. Е. Сакалоўская. «Вы зарэкамендавалі сябе, — гаворыцца ў адрасу, — як спрактыкаваны, прынцыповы і чулы педагог, праца якога з'яуляецца сумленным служэннем народу і Радзіме».

Студэнты першых пасляваенных выпускаў, таварышы па працы, выпускнікі-завочнікі і студэнты стацыянара — усе горача віншуюць свайго сябра і настаўніка.

— Мы сустракаліся з Вамі не толькі на лекцыях ва універсітэцкіх аўдыторыях, — гаворыць выпускніца завочнага факультэта аддзялення журналістыкі, рэдактар М. Ф. Брунеўская.—Вашы змястоўныя лекцыі мы таксама слухалі ў Вышэйшай рэспубліканскай партыйнай школе, будучы ў свой час яе слухачамі. Прыміце, Гаурыл Сяргеевіч, наш скромны падарунак. Калі Вы паглядзіце на яго, успомніце тых, хто так любіу вас, — заканчвае яна сваё выступленне.

Памятныя адрасы ад сваіх калектываў зачытваюць супрацоўнікі рэспубліканскіх газет: «Во славу Родины» і «Чырвоная змена».

З захапленнем слухаюць прысутныя ўспаміны Гаурыла Сяргеевіча аб студэнцкіх дэманстрацыях у Пецербургу ў 1908—1910 гг., аб першых гадах яго журналісцкай і педагагічнай дзейнасці, аб рабоце ў «Правде».

... Урачысты вечар закончан. Моладзь абкружае свайго любімага выкладчыка. Моцныя паціскані рук, цёплыя, развітальныя словы, пажаданні добрага здароуя, плённага, турботнага адпачынку...

— Ім пашанцавала, — гавораць студэнты малодшых курсаў, — яны слухалі лекцыі Гаурыла Сяргеевіча Окулава, яны вучыліся ў газетчыка-праудзіста, у Чалавека з вялікай літары.

ШЛЯХ ШЫРОКІ АДКРЫТ НАМ, МАЛАДЫМ,

На вялікай геаграфічнай карце—густая сетка рознакаляровых флажкоў, агеньчыкаў, надпісаў. Гэта будучыя гідраэлектрастанцыі, заводы, фабрыкі, школы. Паусюдна разгортваецца велічнае будаўніцтва новабудоўляў шостай пяцігодкі.

Можа вось гэтым агеньчыкам, чырвоным флажком абазначана тая мясціна, дзе малады геолаг знойдзе нязведаныя месцанараджэнні карысных выкапняў, а тым агеньчыкам—школа, дзе малады настаўнік запаліць у юных сэрцах падрастаючага пакалення незагасаючы агонь любві да сваёй Радзімы.

Кожны год у розныя бакі нашай неабсяжнай краіны накіроўваецца новы аград выпускнікоў Беларускага універсітэта. У гэтым годзе на шлях працоунага жыцця уступяць звыш 790 маладых спецыялістаў. Геолагі адправяцца у Казахстан, на Урал, у Сібір. Частка з іх будзе вывучаць прыродныя багацці Беларусі. На заводы і фабрыкі поидуць біёзікі, хімікі, матэматыкі. На вопытных сельскагаспадарчых станцыях чакаюць глебазнаўцаў. Але большасць нашых выпускнікоу працуе у школах рэспублікі.

У сённяшнім нумары нашай газеты мы раскажам аб нашых выпускніках.

АТРЫМАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

Дзякую маім выкладчыкам, якія далі мне адукацыю, сфар-

міравалі з мяне інжынера-геолага. Буду даследаваць нетры Беларусі.

Давер'е апраўдаю!

Барыс Гурскі,
выпускнік аддзялення геалогіі.

БУДУ ВЫКЛАДАЦЬ БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

Калі я вучыуся яшчэ ў школе, мне вельмі спадабалася работа настаўніка. Ужо у той час я думаў, што абавязкова пайду вучыцца у педагагічны інстытут, стану выкладаць у школе мову і літаратуру.



Нарэшце, мае мары здзейсніліся. Універсітэт закончаны. З новага навучальнага года я, як і усе выпускнікі-філолагі, буду працаваць у школе, выкладаць беларускую мову і літаратуру.

Думаю, што з тымі абавязкамі, якія стаяць перад совецкімі настаўнікамі, спраўлюся.

М. ПРАШКОВІЧ,
выпускнік аддзялення беларускай мовы і літаратуры.

Голас з калыскі,

Пакой № 28-а у інтэрнаце па вуліцы Свердлова. Тут жывуць Анна і Аляксей Кавальчукі, як гаворыцца у студэнцкім асяроддзі—«жанацкі». На стук у дзверы адказаў дзіцячы голас: «Мо-о-жна». Я увайшоу. Малюсенькі пакой, дзе якімсьці цудам змясціліся ложак, вечны спадарожнік студэнта—тумбачка, калыска. Там і ляжаў маленькі чалавечак у кароткай кашулі—гэта ён так ласкава запрасіў мяне увайсці у пакой.Вітаемся і знаёмімся. Ён гаворыць, што яго мама і тата пайшлі у магазін, і даведаушыся, што я «ад газеты», згадзіуся адказваць на мае пытанні. «А кой тебе годік?»—міжвольна вырвалася у мяне. Але мой новы таварыш неузабаве выявіў знаёмства з класікай. «Еще и первый не миновал»,—адказаў ён басам і уздыхнуу. І пачалася цікавейшая размова, якую мы і перадаем.

— Раскажы аб сваіх маці і бацьку.

— Маю маму завуць Аня. Яна у минулым годзе закончыла філалагічны факультэт нашага універсітэта (ён сапрауды сказаў «нашага»). Потым вучыла дзяцей у школе, а зараз яна рэдактар у вучэбна-педагагічным выдавецтве.

— А зараз раскажы аб бацьку.

— У майго таты імя такое-ж, як і у мяне—Аляксей. Маці гаворыць, што яго назвалі так у гонар мяне, альбо мяне у гонар яго—я ужо забыуся (ён вінавата усміхнууся). Мой тата ваяваў на вайне. А потым, ён быу шафёрам,—гэта ён на машынцы катауся,—(растлумачыу нам Аляксей-малодшы), а у вечары, як маленькі, хадзіу у школу. Ён вучыуся так добра, што быу прыняты ва універсітэт на геолага-геаграфічны факультэт. У гэтым месяцы ён абараніу дыпломны праект аб старобінскіх солях і застаецца працаваць у Беларусі. Мы едзем працаваць утраіх—тата, мама і я—гэтымі словамі закончыу нашу гутарку студэнцкі сын Аляксей.

В. МАШКОУ.

Ці можна гэта забыць?

Памятаю першы дзень заняткаў ва універсітэце. Усё было новым і незвычайным... Першая лекцыя па фізіцы. Колькі новага пазналі мы ужо у гэтыя 2 гадзіны. А пасля школы гэта было вельмі захапляюча! І так працягвалася дзень за днём усе пяць год.

Ці можна калі-небудзь забыць лекцыі А. Н. Сеучанка, Б. І. Сцяпанава, Ф. І. Фёдарава, І. Г. Некрашэвіч! Колькі там было новага і цікавага, як проста і ясна падавалися такія складаныя рэчы! Гэта яны прымушалі нас яшчэ больш палюбіць фізіку, адчуць, як гаворыцца, у ёй смак. А практыка у Дзяржаўным аптычным інстытуце імя Вавілава у Ленінградзе, работа над курсавой і дыпломнай працай у лабараторыях АН БССР—усё гэта незабыуна.

Колькі новых сяброу паявілася за гэты час па вучобе і спорту. Ва універсітэце я выканала першы разрад па лыжах і другі—па гімнастыцы. І на новым месцы я не збіраюся кідаць гэтыя любімыя заняткі.

Мяне накіравалі працаваць у адну з школ Бягомльскага раёна. Радзіма вучыла нас, а зараз нашы веды мы павінны перадаваць дзецям.

Праз два-тры гады думаю паступіць у аспірантуру, а зараз да пачатку заняткаў у школе жадаю з'ездзіць на уборку цаліннага ураджаю.

Вялікае дзякуй табе, універсітэт, за усё цудоунае, што ты нам дау. Шчырае дзякуй!

В. КАРАТКЕВІЧ,
выпускніца фізіка-матэматычнага факультэта.

РАЗМОВА

Сёння ветлівы твар твой
Выглядае так строга.
З інстытута па-карце
Ты шукаеш дарогу

Да няведамай вёскі
У глыбінным раёне.
Што-ж, давай па-сяброуску
Пагаворым і сёння!

Я у школу другую
Еду гэтай вясною,
І, вядома, шкадую,
Што не разам з табою,

Што у розных раёнах
Нас чакае работа...
Што-ж няхай пашталёнам
Будзе болей турботау!

Ты гаворыш, што у думках
Разыходзімся тут мы.
Што крыху будзе сумна
Там пасля інстытута.

Нас-жа стрэнуць у вёсцы,
У палескай, у новай,
Пасланцоу маладосці,
Самым ветлівым словам.

Там з людзьмі, што у змаганне
Сёння выйшлі з балотам,
Свае думы, жаданні
Мы падзелім ахвотна.

І няма справы болей
Даражэйшай для сэрца,
Як пуцёукі у школе
У жыццё выдаць дзецям.

Сумаваць нам, сяброука,
Там не знойдзецца часу,
Ёсць кіно, пастаноукі,
Сёння у клубах калгасаў.

Нават арыя Ольгі
І Таццяны, мне любай,
Ты таксама цудоуна
Праспяваеш у клубе.

Дык не будзь гэткай строгай:
Да глыбінных раёнаў,
Мы па карце дарогі
Адшукаем сягоння.

Ул. НЯДЗВЕДСКІ,
выпускнік БДУ.

УСЯГО НАЙЛЕПШАГА!

У пакоі для праектавання на геолага-геаграфічным факультэце і зараз бывае шумна. Сюды збіраюцца геолагі. Хутка, вельмі хутка яны раз'едуцца па розных кутках краіны.

За дзвярыма чуюцца звонкія галасы.

— Запаляр'е, родная мая старонка,—прапеу пехта, перыфразіруючы песенныя строкі.

Яго перабіу другі голас: «Што Запаляр'е... Вось беларускае Палессе... Нават такія месцы ёсць, дзе ніколі нага чалавека не ступала. Вось, дзе прастор разведчыкам.

Георгій Емельянау, пачуушы урыукі размовы, усміхнууся, мауляу, Урал, Запаляр'е, Палессе... Усё гэта нядрэнна. А вось Казахстан, куды ён атрымау прызначэнне, зусім іншая справа. За што ні возьмешся,—усё новае, толькі працуй, не падай духам.

Але усё гэта напарадзе, а пакуль, як бачыце на здымку, Георгі Емельянау і Яугеп Гуціп скланіліся над картай—далека друг ад друга прыдзецца ім жыць і працаваць.

І застаецца сардэчна пажадаць маладым геолагам: «Усяго найлепшага, сябры!»

М. ПІЛЬШЧЫКАЎ.

Калі з любоу'ю адносішся да справы...

«...Тав. Нечай паказау, што ён здольны самастойна вырашаць даволі складаныя інжынерна-тэарэтычныя задачы.

Яго дыпломная праца прадстаўляе вялікі інтарэс для радыёканструктарау і несумненна будзе старанна вывучана і выкарыстана на Мінскім радыёзаводзе.

Дыпломная праца тав. Нечай заслугоувае выдатнай адзнакі».

Так пісау у рэцэнзіі на дыпломную працу студэнта фізіка-матэматычнага факультэта галоуны інжынер Мінскага радыёзавода В. Пумпянскі.

А год 20 таму назад...

...Нарэшце усе прыгатаванні закончаны. Застаецца толькі павярнуць рычажок пераключацеля і стане вядома—атрымалася ці не.

— Ну, давай, давай, Жорка, спрабуй...

Высокі хударлявы хлапчук прыкметна хвалюецца. Ён моучкі глядзіць на акружыушых яго таварышоу, а пальцы дробна перабіраюць тэлефонны шнур, які ідзе да навушнікау ад маленькай драуляной скрыначкі на стале перад ім. Загавора ці не загавора? Потым асцярожна, нясмела паваргчвае галоуку пераключацеля на «прыём». І адразу:

— Увага! Гаворыць Масква! Перадаем апошнія паведамленні.

Далёкі спакойны голас дыктара праз шумы і трэскі намех даходзіць да самага сэрца. Першая перамога! Маленькая, але перамога! Няважна, што аб ёй не пісалася у газетах і не перадавалася па радыё. Гэта была скромная перамога цікаунасці і упартасці над баязлівасцю і нерашучасцю першага крока.

Да, прасценькі дэтэктарны прыёмнік увёу Георгія у бязмежны свет радыё. І гэты блакітны свет завалодау марамі падлетка. З кожным разам канструкцыі прыёмнікау, зробленных рукамі Георгія, ускладняюцца. Першы дэтэктарны прыёмнік дауно замяніу супергетэрадынны. Хацелася пазнаць усе тайны нябачных радыёхваль, зрабіць нешта незвычайнае і карыснае.

Але пачалася вайна і унесла у жыццё людзей свае жорсткія законы. Георгі тады канчау сям'годку. Вучобу прышлося кінуць.. А потым—армія. Юнацкае захапленне дало сябе знаць і тут. Ён стау радыстам. Пасля дэмабілізацыі Георгі рашыу атрымаць сярэднюю і вышэйшую адукацыю. Ён працуе у радыёмайстэрні і адначасова займаецца у вячэрняй школе рабочай моладзі.

Упартая вучоба у школе увянчалася паступленнем яго на фізіка-матэматычны факультэт. І калі прышоу час пісаць дыпломную працу, Георгі узяу тэму, блізкую яго сэрцу,—з галіны радыётэхнікі.

— У сваёй дыпломнай працы,—расказвае Георгі, — я разглядаю прынцыпы разліка трохконтурнага фільтра прамежкавай частаты. Такія фільтры у апошні час сталі ужывацца у супергетэрадынных прыёмніках першага і вышэйшага класаў для атрымання высокаякасных паказчыкаў ва узмацняльніках прамежкавай частаты. Аднак тэарэтычных абаснаванняў для разліку трохконтурных фільтраў не было.

— Мне удалося зрабіць сёе-тое у гэтай галіне. А іменна—вывесці формулу, якая дае магчымасць пры заданых дабротнасцях (ці затуханнях) і пры заданай шырыне паласы прапускання фільтра атрымаць велічыню сувязі паміж контурамі.

Безумоуна, для чалавека, незнаёмага з радыётэхнікай, гэтыя словы—пусты гук. На самай-жа справе за імі хаваецца упартая настойлівая, карпатлівая праца. Бывалі і зрывы, часта работа ішла не наверпаму шляху. Але хваляванні засталіся ззаду. Вынікі радуюць Георгія: яго дыпломная праца ацэнена на «выдатна», галоунае—яна будзе практычна выкарыстоувацца канструктарскім бюро Мінскага радыёзавода.

У маі гэтага года Георгі атрымау назначэнне на працу у Акадэмію навук БССР.

Так пажадаем Георгію Нечаю выпускніку, якім ганарыцца наш універсітэт, вялікіх поспехау у жыцці і працы.

Калі з любоу'ю адносішся да справы — поспех забяспечаны.

І. ВЫСОЦКІ.

або незвычайнае інтэрв'ю



МЫ АЙЧЫНЕ ЎСЕ СІЛЫ АДДАДЗІМ!

ЖЫХАРКІ 27-га

Тры гады сумеснага жыцця здружылі дзяўчат 27-га пакою корпуса «Б», здружылі настолькі, што расказаць аб гэтых гадах пабочнаму чалавеку—справа нялёгкая.

— Пакой наш як пакой, самы звычайны,—ухіліста гаворыць «бяззменны» староста 27-га Ала Нарадзецкая.

Як мы жылі гэтыя гады? Жылі дружна. Добра жылі. У нас заусёды было многа агульных цікавых спрау. Аб тым, каб скрыць што-небудзь, утаіць друг ад дружкі, не было і думкі. Акрамя, зразумела, некаторых «сардэчных тайн»,—паспешна дадае яна пад гучны смех сваіх сябровак Шуры і Ані.

На працягу III і IV курсаў мы наладзілі «калгаснае харчаванне». Спецыяльна устаноуленыя дзяжурствы па пакою давалі вялікі эфект: па-першае, мы не карысталіся паслугамі універсітэцкай сталовай і, такім чынам, зберагалі час, па-другое, у пакоі у нас была ідэальная чысціня.

— Раскажы пра патэфон,—напамінае Шура Сікорская.

— Так. Вось за гэты самы ідэальны парадак нас прэміравалі тады патэфонам. Прауда, праз год мы яго згубілі. Патэфон служыу у якасці пераходнага прызу, а паколькі ён пераходны, то... (усе зноу дружна смяюцца.) А усё-такі шкада. Гэта быу «трагічны» выпадак у нашым сумесным жыцці. Прауда!—горача запэуняе яна.—Зараз гэта ужо здасцца па-дзіцячаму смешным, але тады гэта было для нас сапраўднай крыудай.

А наогул-жа мы хныкаць не любім. Не такія мы людзі! Іншы раз здарыцца што-небудзь—разгубішся упачатку. Жыві чалавек не у інтэрнаце, а дзе-небудзь у іншым месцы, ён, бадай, і хандрыць пачне. Мы-ж размауляем іншай мовай: «Прэч слёзы, убок хандру! Выкладай, што у цябе здарылася!»

Гэта вельмі важна—заусёды быць чулым да чалавека і уважлівым. Вось, здаецца, такая звычайная справа—адзначыць дзень нараджэння сяброукі. Мы ніколі не забываем гэтых дат. Што не заусёды удавалася аднолькава адзначыць, гэта так, але пры усіх умовах мы укладалі у гэтую справу усё сваё уменне і заботу.

Усё наша жыццё,—расказваюць яны,—праходзіла неадрыуна ад жыцця усяго нашага курса. Многа слауных спрау зрабіу наш калектыу. І зараз, калі мы канчаем універсітэт, усё, што звязана з ім, здаецца такім дарагім, хвалюючым, незвычайным. Не уяуляем, як мы з усім гэтым расстанемся.

Яшчэ у мінулым годзе мы крыудзілся, калі нас памылкова лічылі за трэцекурснікау, а зараз, назаві нас хто-небудзь першакурсніцамі, ці нават дзесяцікласніцамі, мы-б толькі узрадаваліся.

Гэты год быу для нас вельмі напружаным. Летам праходзілі практыку: Надзя з Раяй тут, у Мінску, а мы утраіх—на Ленінградскім аптычным заводзе і у Інстытуце оптыкі. Потым працягвалі працу над дыпломнай работай. Абарона дыпломных прайшла паспяхова.

Бываць усім разам гэты год даводзілася рэдка. Затое, калі выдавалася вольная гадзіна, мы стараліся выкарыстаць яе, як мага больш карысней і цікавей: хадзілі разам у кіно, тэатр, а калі заставаліся дома—чыталі, гулялі у шахматы, вышывалі і шылі.

У гэты год адзінства нашага пакоя было пахіснута. Нашы сяброукі Рая Майтак і Надзя Жэнеуская выходзяць замуж. Але у гэтай падзеі усё-ж больш радасці. Мяркуем хутка пагуляць на іх вяселлі.

Прайшло размеркаванне выпускнікоу, і зараз жыхаркі 27-га пакоя рыхтуюцца да працы. Ала Нарадзецкая, Шура Сікорская і Аня Кубар едуць у вясковыя школы настаунікамі фізікі. Яны з захапленнем расказваюць аб сваёй будучай працы, аб тым, якія гурткі арганізуюць у школах. У іх чамаданах ужо укладзены навуковыя часопісы, стопкі кніг, папулярныя брашуры аб найбольш цікавых з'явах прыроды.

— У добры час, сябры! Хай не згасаюць ваш юнацкі пыл і імкнівасць! Поспехау вам, жыхаркі 27-га!

Л. ШУМАН.

ДАВЕР'Е АПРАЎДАЕМ!

Як толькі падумаеш, што не прыдзецца больш наведваць лекцыі, і наогул, што усе мы раз'едземся у розныя раёны,—становіцца так шкада, што прайшло студэнцкае жыццё. Хацелася-б яго прадоужыць. Разам з тым, мы вельмі рады, што закончылі беларускае аддзяленне універсітэта. Мы шчаслівы усведаміць, што, едучы у раёны нашай рэспублікі, будзем прывіваць маладому пакаленню беларусаў любоу да нашай Радзімы, да роднай Беларусі.

Вялікае дзякуй нашым выкладчыкам А. М. Базыленка, М. І. Жыркевічу, Д. Е. Фактаровічу, С. Ц. Янчанка і іншым. Давер'е, якое яны на нас усклалі, апраўдаем.

А. РАГУЛЯ, Л. ЛЕЎЧЫК, В. БАЛАЖЫНСКАЯ, Н. РАГОЎСКАЯ, Л. АКУЛЁНАК.

Глеб Дамінікоўскі—выпускнік аддзялення геалогіі. Ён паспяхова абараніў дыпломную работу на тэму: «Геалогія і дэталёвая разведка Селянкінскага месцанараджэння ільменаруціла». Праз невялікі прамежак часу Глеб паедзе працаваць на Урал.

АПОШНЯЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Апошні экзамен на V курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Здаецца, што тут асаблівага, калі здаеш за гады студэнцкага жыцця 30-ты экзамен? І усё-ж пяцікурснікі хвалююцца. Як здасць група—гэтае пытанне хвалюе кожнага выпускніка.

Вось ва аўдыторыю ўваходзіць Святлана Клименценка. Усе дзяўчаты імкнуцца заглянуць у шчылінку дзвярэй, каб убачыць, як адчувае сябе іх добры, чулы і найлепшы таварыш—Света. Не адстаюць ад іх і хлопцы. Як яна адкажа? За усе пяць год у Святланы не было іншых адзнак, акрамя выдатных. Усе упэунены — яна абавязкова атрымае «выдатна».

З першых дзён заняткаў ва універсітэце Света Клименценка пачала займацца настойліва, упарта. Яе адказы на экзаменах былі заусёды выдатнымі. Асабліва праявіла яна сябе у навукова-даследчай працы. Яе гуртковыя работы заусёды атрымоувалі на аглядах высокую адзнаку.

...З першага курса у аднакурснікаў Аляксея Рагулі і Святланы Клименценка нарадзілася вялікая дружба. Яна перарасла у цудоўнае каханне. Іх шчасце стала шчасцем для усяго курса. Зараз яны разам едуць працаваць настаунікамі ў Старадарожскі раён. Там прыкладуць усе свае сілы, усе свае багатыя веды, якія ім дау універсітэт, да пачэснай справы—выхавання дзяцей.

І. СТАРАВОЙТАЎ.

Застаюся у роднай Беларусі

Перагорнута апошняя старонка заліковай кніжкі. Пяць год упорнай і нялёгкай, але захапляючай вучобы засталіся ззаду. Трыццаць экзаменаў — трыццаць выдатных адзнак, залікі, практыка...

Многае прадстае перад вачыма, калі перагортваеш заліковую кніжку.

Мне прыпамінаецца той дзень, калі перад намі упершыню расчыніліся дзверы універсітэцкіх аудыторый, і рамантыка школьных дзён уступіла месца навукам, раскрываючым чароуны свет зямных скарбаў. З кожным новым вучэбным годам глыбей станавіліся веды. І вось, нарэшце, прышоу дзень, калі старшыня Дзяржаўнай камісіі павіншаваў мяне і маіх таварышоу з заканчэннем універсітэта і прысваенне звання інжынера-геолага.

Праз паутара месяцы—на работу. Я буду працаваць у роднай Беларусі.

Нельга думаць, што сапраўдны геолаг толькі той, хто карабкаецца па горных кручах, штурмуе на кволай ладчонцы парожыстыя рэкі, шукае алмазныя трубкі у сібірскай тайзе. Не! Сапраўдным геолагам можна быць і у Беларусі, нетры якой вывучаны вельмі слаба. Калі-б 10—15 год назад хто-небудзь сказаў, што у нашай рэспубліцы ёсць нафта, каменны вугаль, калійныя солі, яго папросту палічылі-б дзіваком. А зараз аб гэтым добра вядома кожнаму школьніку.

Мы, выпускнікі-геолагі, якія застануцца у роднай Беларусі, прыкладзем усе свае намаганні, каб раскрыць нашаму народу новыя старонкі мудрай кнігі прыроды.

Ілья УР'ЕЎ.

Працаваць — на завод

Хутка праляцелі студэнцкія гады. І вось мы на парозе самастойнага жыцця. Перад кожным з нас—пэуны участак працы, дзе трэба прымяніць атрыманы запас ведаў.

Я накіравана на завод і з вялікім задавальненнем буду там працаваць. Ды і большая частка нашых выпускнікоу выказваюць жаданне працаваць непасрэдна на вытворчасці, дзе нашы веды змогуць знайсці больш рацыянальнае выкарыстанне. Але я ведаю, што на любой рабоце студэнты хімічнага факультэта будуць працаваць добрасумленна.

Л. СУКАЛА,
выпускніца хімічнага факультэта.

З любоўю да хіміі

У 1952 годзе я паступіла на хімічны факультэт універсітэта. Тут я яшчэ больш, чым у школе, палюбіла хімію. Універсітэт дау мне глыбокія тэарэтычныя веды, а зараз іх прыдзецца прымяніць на практыцы.

На працу я еду у Ваукавыскі раён Гродзенскай вобласці выкладчыкам сярэдняй школы. Сваім вучням я таксама пастараюся прывіць любоў да хіміі, таму што хімія у наш час мае вялікае прымяненне у розных галінах народнай гаспадаркі нашай краіны.

І. ДЗЕРАЧЭНІК,
выпускніца хімічнага факультэта.

ШЧЫРАЕ ДЗЯКУЙ!

Пяць год вучобы ва універсітэце, зданы усе экзамены, абаронены дыпломныя праекты. Мы дасягнулі мэты, да якой імкнуліся усе гады вучобы. Большасць з нас, выпускнікоу геолага-геаграфічнага факультэта, едзе на работу ва усходнія раёны нашай краіны. Там мы пастараемся на практыцы апраўдаць пачэснае званне выпускніка нашага універсітэта, званне інжынера-геолага.

Мы вельмі задаволены, што едзем у багацейшыя залежамі карысных выкапняў раёны Савецкага Саюза, дзе ёсць многа неразведаных плошчаў. Там мы пастараемся прыкласці усе нашы намаганні, каб наша краіна была яшчэ багацейшай.

Мы ніколі не забудзем нашу першую геалагічную практыку. Кандыдат геолага-мінералагічных навук В. К. Голубцоу дау нам тады першае паняцце аб жыцці і рабоце геолага.

Шчырае дзякуй нашым выкладчыкам, якія імкнуліся усе 5 год даць нам як мага больш ведаў, неабходных для практычнай дзейнасці.

Ж. ГРАБОЎСКАЯ,
Р. ШЭМПЕЛЬ, М. ЧАЎС.

НА ЗДЫМКУ: Р. Шэмпель і Ж. Грабоуская—яны накіраваны у Краснаярскі край, М. Чаўс—у Казахстан.

На біялагічных станцыях БДУ

...Машына вынырнула на узгорак і спынілася. Мы убачылі перад сабой нешта велізарнае і яркае, ззяючае пад праменямі чэрвеньскага сонейка мноствам рознакаляровых фарбаў.

Дык вось які ты, Нарач! Колькі паэтаў услаўлялі тваю прыгажосць! Колькі славутых падзей адбылося на тваіх паросшых соснаю берагах!

Адчуваеш нявольную павагу, калі глядзіш на гэтага волата. Але зараз Нарач спакойны. Ён нібыта дрэмле. Толькі спевы птушак ды шэпт соснаў парушаюць цішыню. Для чалавека тут сапраўдны рай, тым больш, калі ён—біёлаг.

Іменна пагэтаму тут біялагічная станцыя нашага універсітэта. Яна была заснавана ў 1946 годзе. Тады будаўнікі узвялі першы дом, у якім змяшчалася уся гаспадарка станцыі. Зараз-жа для паслуг практыкантаў і навуковых работнікаў тут маюцца добра абсталяваная лабараторыя, музей жывёльнага міру возера Нарач і яго наваколля, вучэбны корпус, сталовая і—у прыдачу да усяго гэтага—магазін.

Біястанцыя працягвае будавацца. На беразе возера, над абрывам, неузабаве з'явіцца дом на 12 кватэр для навуковых работнікаў. У першых числах ліпеня павінна адбыцца адкрыццё і уласнага клуба. Ён будзе пабудаваны рукамі студэнтаў.

— Работа на будаўніцтве клуба,—паведаміў нам дэкан біяфака П. Г. Пятровіч, — уваходзіць састаўной часткай у праграму практыкі студэнтаў. Акрамя тэарэтычнага курса, праслуханага студэнтамі на універсітэцкай лаўцы, практыканты павінны атрымаць пэуныя працоуныя навыкі. Гэтаму і паслужыць будаўніцтва уласнага клуба.

...Мы наведалі лабараторыю станцыі. Там мы засталі старшага навуковага супрацоуніка П. С. Невядомскую. Склаўшыся над вялізным серабрыстым ляшчом, яна праводзіла нейкія вымярэнні. (Фота 3).

— Я вывучаю біялогію ляшча і перспектывы яго развіцця на возеры Нарач, — у адказ на наша пытанне гаворыць Паліна Самойлаўна. — Наогул на нашай станцыі навукова-даследчыя работы вядуцца яшчэ з 1947 года. У аснове іх ляжыць вывучэнне флоры і фауны трох суседніх азёр: Нарачы, Мястра і Баторына, злучаных пратокамі. На кожным з іх маюцца нашы пункты. Работы мы праводзім круглы год. Іншы раз бывае цяжка, асабліва восенню і ранняй вясной, калі нялёгка перасоўвацца па возеру на звычайнай лодцы. Але нам у бліжэйшыя дні прысылаюць маторны кацер. Прыязджайце пакатацца,—пажартавала яна.

...На станцыі часта можна сустрэць студэнтаў, якія пішуць тут курсавыя і дыпломныя работы. Так, напрыклад, студэнтка 5 курса Валянціна Кушч збірае матэрыял для дыпломнай работы аб стрававanні жукоў. Як сцвярджаюць спецыялісты, гэта вельмі арыгінальная праблема, над якой варта папрацаваць.

...Вынікі навукова-даследчых прац, праводзімых на біястанцыі, маюць важнае практычнае значэнне. Абмеркаванню іх быў прысвечан рад навуковых канферэнцый. У рабоце апошняй з іх, якая адбылася у красавіку гэтага года прымалі удзел вядомыя вучоныя Беларусі, рэспублік Прыбалтыкі, гарадоў Масквы і Ленінграда, а таксама вучоныя Польскай Народнай Рэспублікі.

На матэрыялах возера Нарач рад вучоных нашага універсітэта (т. т. Гольцава, Драко і Пятровіч) абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Загадчык біястанцыі прафесар Г. Г. Вінберг выдаў кнігу, у аснову якой прыкладзены даследаванні на возеры Нарач. Некалькі работ прысвяціў возеру і акадэмік Ц. Н. Годнеу.

Ад масцітых вучоных не адстае моладзь. Так, аспіранты Беляцкая і Сушчэня падрыхтавалі да абароны свае кандыдацкія дысертацыі. Набліжаецца да завяршэння і праца над кандыдацкай дысертацыяй у аспіранткі Е. Паповіч. Тэма яе даследаў—дравесныя семяеды. Яна шукае метады барацьбы з гэтымі шкоднікамі лесу.

...На Нарач паехала новая група практыкантаў. Гэта студэнты I курса біяфака. Іх чакае захапляючая праца на берагах цудоунага возера.

В. МАШКОЎ,
І. РУДАМЁТАЎ.

Гучаць фестывальныя песні

Якую вялікую адказнасць адчуваў кожны з удзельнікаў мастацкай самадзейнасці перад выступленнем на Усебеларускім фестывальным конкурсе!

...Лёгкі ўзмах рукі дырыжора І. Е. Кліёнскага—і зала напоўнілася дзівоснымі гукамі дзявочых і юнацкіх галасоў. Велічны напеў «Песні аб партыі» змяняецца задушэўнымі гукамі беларускай народнай песні «Ой на гары пшаніченька». Цёпла выконвае універсітэцкі хор песні «Лявоніха», «Пайду, Ясю», «Чорныя вочкі, пара ужо спаць», «Гэй видно село».

...Гучыць магутны голас пяцітысячнага гарадскога хора на стадыёне «Дынамо» пад акампанемент аркестра у 150 чалавек, і у ім чутны звонкія галасы нашых харыстаў. Выконваюцца «Дзяржауны гімн Беларускай ССР», беларуская народная песня «Зялёны дубочак», а таксама песні: «Смело, товарищи, в ногу», «Ленин всегда с тобой», «Гимн демократической молодёжи» і іншыя.

Вельмі упартая работа папярэднічала гэтым выступленням. З моманту разнёсшайся весткі аб правядзенні фестывалю толькі і было размоў, як найбольш паспяхова на ім выступіць. Колькі прышлося патраціць сіл і часу кіраўніку і дырыжору хора І. Е. Кліёнскаму і бюро хора, каб згуртаваць калектыу, дабіцца бездакорнага выканання песень. Нямала паклапацiўся Пятро Чарнуха—староста хора, каб ні адзін з удзельнікаў не прапускаў рэпетыцый.

І вось жаданы поспех! На адбыушымся гарадскім конкурсе самадзейных келектываў хор БДУ заняу другое месца і адстаяу права удзелу ва Усебеларускім фестывалі.

...Прагучэла апошняя песня. Пытлівыя вочы ўдзельнікаў хора накіраваны на журы конкурса: ці спадабалася? Вядома, спадабалася.

У дні фестывалю паспяхова выступілі універсітэцкія танцоры. Лёгка, нібы матылёк, танцавала Вера Яноўская ў рускай плясцы. Глядач быу задаволен высокай тэхнікай выканання удзельнікамі танцавальнага калектыва «беларускай полечкі з прытопам. і «Лявоніхі».

Самадзейныя калектывы універсітэта з гонарам апраудалі ўскладзеныя на іх надзеі.

В. ІСТРОЎ.

Удзельнічаем у распрацоўцы кодэксаў

На VI сесіі Вярхоунага Совета СССР быу прынят «Закон аб аднясенні да ведзення саюзных рэспублік законадауства аб уладкаванні судоу саюзных рэспублік, прыняцці грамадзянскага і працэсуальнага кодэксаў». За Саюзам ССР пакінута толькі устанауленне асноу законадауства у гэтай галіне.

Да прыняцця упамянутага закона, як вядома, саюзныя рэспублікі не мелі праu на ажыццяўленне законадауства у галіне судауладкавання і судавытворчасці, грамадзянскага і крымінальнага кодэксаў. Выданне гэтых законадаучых актаў, адпаведна Канстытуцыі ССР, было аднесена да кампентэнцыі Саюза ССР. Значнае пашырэнне законадаучых праvоў саюзных рэспублік, ажыццёуленае на VI сесіі Вярхоунага Совета СССР, з'яляецца яркім праяўленнем клопатаў Комуністычнай партыі аб далейшым умацаванні Совецкай дзяржавы, аб пашырэнні суверэных правоу саюзных рэспублік, аб развіцці соцыялістычнай дэмакратыі.

Зараз падрыхтоуваюцца і абмяркоуваюцца праекты агульнасаюзных асноу крымінальнага, грамадзянскага і працэсуальнага законадаўства. У саюзных рэспубліках вядзецца вялікая праца па падрыхтоўцы праектаў рэспубліканскіх кодэксаў. Такая праца пачата і ў БССР. У ёй прымаюць удзел і выкладчыкі нашага універсітэта. Дацэнты Г. А. Павецьеу і М. Н. Меркушау уключаны ў склад камісіі ЦК КПБ па выпрацоўцы новых кодэксаў.

Да работы па складанню новых кодэксаў прыцягнуты таксама амаль усе выкладчыкі прававых дысцыплін. Вялікі ўклад у распрацоўку новых кодэксаў уносяць выкладчыкі кафедры крымінальнага права і працэсу. Удзел гэтых выкладчыкаў у распрацоуцы і падрыхтоўцы новых кодэксаў БССР запланаван у плане навукова-даследчай работы на 1957 год.

Дацэнт Г. А. Павецьеў і старшы выкладчык Ю. П. Смірноў прымаюць удзел у распрацоўцы новага кодэкса аб працы. Дацэнт Ф. І. Гаўзе, кандыдат юрыдычных навук В. Ф. Чыгір і К. А. Барзова ўключаны ў склад рабочай камісіі па падрыхтоуцы новага грамадзянскага кодэкса БССР. Кандыдат юрыдычных навук Н. Г. Юркевіч з'яуляецца членам камісіі па распрацоуцы кодэкса законаў аб шлюбе, сям'і і апецы. Дацэнт Н. А. Волкау і кандыдат юрыдычных навук І. А. Юхо заняты распрацоукай па падрыхтоўцы новага грамадзянска-працэсуальнага кодэкса.

Работа над кодэксамі вядзецца у цеснай садружнасці з работнікамі Міністэрства юстыцыі, Пракуратуры БССР, МУС.

І. С. ЦІШКЕВІЧ.

НАВУКОВАЯ СТАНЦЫЯ ЦІ КУСТАРНАЯ АРЦЕЛЬ?

Сучаснаму чалавеку, які вырас у век электрычнасці і атамнай энергіі, цяжка сабе уявіць старажытнага земляроба, які ускапваu поле завостраным сукам.

Бяссільны перад грознымі стыхіямі прыроды, не здольны супроцьстаяць іх разрушальным дзеянням, ён станавіуся на калені для малітвау і заклінанняу, прасціраючы рукі насустрач таемнаму бажаству.

Хто жадае убачыць аналагічны малюнак, дзе чалавек прыдаулен сіламі прыроды, павінен наведаць навукова-даследчую станцыю нашага універсітэта у Чырвоным Урочышчы.

Згодна з планам навукова-даследчай работы кафедр біёлага-глебавага факультэта і справаздач, на станцыі вырашаюцца складаныя і актуальныя пытанні навукі. У прыватнасці, група супрацоунікаў пад кіраўніцтвам прафесара Турбіна павінна займацца сартавывучэннем кукурузы, падборам сартоу для скрыжавання і атрымання гібрыднага насення ва умовах нашай рэспублікі.

Будзе залішнім даказваць выключную важнасць гэтай задачы у сучасны момант.

Калектыу супрацоунікаu і студэнтаu на чале с дацэнтам Калішэвічам працуе над тэмай «Аб адпаведнасці карнявой і надземнай масы у зернявых культур на торфе».

Група біёлагаu пад кіраўніцтвам дацэнта А. І. Палілава займаецца выяўленнем магчымасцей і шляхоу выкарыстання метаду скрыжавання без кастрыцы, у селекцыйна-насенняводчай рабоце з самаапыляючымі культурамі. Запланаван рад вопытаu па вывучэнню хвароб зернявых, у прыватнасці, кукурузы.

Але адна справа—складці добры план, і зусім іншая — выканаць яго.

Што-ж датычыцца станцыі у Чырвоным Урочышчы, то яе цяперашні стан не дазваляе у поунай меры вырашэнню задач, пастаўленых у планах кафедр.

Станцыя не распалагае неабходным навуковым абсталяваннем, для правядзення усяго комплексу работ і назіранняу. Акрамя таго, тут не маецца ніякаu механізацыі працаёмкіх работ. Сельскагаспадарчы інвентар настолькі прымітыуны (да таго-ж яго недастаткова), што супрацоунікі і студэнты часта карыстаюцца звычайнай палкай для узрыхлення глебы і апрацоукі пасеваu.

Некалькі год падрад вучоныя факультэта узнімалі пытанне аб стварэнні у Чырвоным Урочышчы лабараторый: селекцыйнай і фотасінтэзу. Нямала было гарачых спрэчак, нямала прагучала прыгожых прамоу, спісана шмат папераu на пратаколы і дакладныя запіскі. Але гэтае пытанне так і не зварухнулася з месца. Не менш было размоу і аб памяшканнях станцыі. Маючыеся у Чырвоным Урочышчы домікі не прыгодны для круглагадовай працы. Яны барачнага тыпу і патрабуюць капітальнага рамонту. Летам і восенню памяшканні зацякаюць, плеснеюць, а зімой у разбітыя вокны і шыбы свабодна урываюцца шматкі снегу. Усё гэта псуе мэблю, прыборы і выключае магчымасць працаваць у зімовых умовах.

— Не раз мы прасілі адміністрацыю,—расказвае А. І. Палілау,—каб у вучэбным доміку устанавілі печку. У мінулым годзе ад сырасці у нас сапсавалася насенне люпіну. Але гаспадарнікі, невядома па якой прычыне, знаходзяць, што правядзенне трубы прынясе большую шкоду памяшканню, чым сырасць...

Нельга абыйсці маучаннем і той факт, што станцыя не забяспечана у дастатку вадой. Маючыйся на тэрыторыі станцыі просты калодзеж ні у якім разе не можа забяспечыць не толькі паліу, але і патрэбу супрацоунікаu станцыі.

Часта можна назіраць, калі навуковы работнік, каб вымыць пасуду, гадзінамі сядзіць каля калодзежа і чакае пакуль збярэцца вада, каб зачэрпнуць вядром.

Надыйшла ужо пара устанавіць на тэрыторыі станцыі насос і вадазборны бак. Рашэнне гэтай задачы палягчаецца таму, што сёлета туды праведзена электрычнасць.

Калі-б кіраўніцтва станцыі, і у прыватнасці дырэктар тав. Куніцкі, праяўлялі больш растаропнасці і адказнасці, запасы вады можна было накапляць у крайнім выпадку шляхам падвозу, тым больш, што маюцца два рабочых кані. Уся бяда у тым, што на станцыі няма для гэтага прасцейшага інвентару і у прыватнасці бочак. А устанавіць спецыяльныя бочкі для захавання вады каля парнікоу, кустарнікаu, градак—неабходна.

Асноуная тэрыторыя станцыі знаходзіцца на схіле узгорка. Таму, зразумела, пасля дажджоу пасевы размываюцца. Дажджавыя воды накіроуваюцца ўніз, парушаюць гнёзды пасадак, заносяць пяском пасевы і размываюць аuрагі.

У мінулым годзе вялікая шкода была нанесена ячменю Палілава. Сёлета занесены пяском участкі кукурузы аспірантак Лабоцкай і Смірновай, студэнткі Асташэвіч і іншых. Гэтую бяду можна было папярэдзіць, калі-б кіраўніцтва станцыі паклапацілася правесці канавы для адвода вады пры дапамозе канавакапацеля. Задача гэта не цяжкая. І тав. Куніцкаму замест таго, каб бездапаможна разводзіць рукамі, трэба дамовіцца з меліяратыўным атрадам аб прарыцці каналау.

Такое становішча на станцыі склалася і у выніку таго, што адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта, дэканат не займаюцца стварэннем у Чырвоным Урочышчы нармальных умоў для творчага эксперыменту. Арганізатарскую работу яны падмянілі агульнымі размовамі на паседжаннях, састауленнем шматлікіх пратаколаu і запісак.

На факультэце ёсць рад таварышоу, якія глядзяць на станцыю, як на маходны бівуак, але не як на сапраўдную навукова-даследчую базу. Пацверджаннем гэтага з'яуляецца сумная гісторыя з батанічным садам.

Некалькі год назад біёлагі пажадалі стварыць свой універсітэцкі батанічны сад. Ініцыятыву падтрымала міністэрства. Далі сродкі, адвялі участак. Мінулай восенню дрэвы і кустарнікі былі пасаджаны на плошчы каля двух гектараў. Але работа праводзілася наспех, без захавання неабходных правілау. Патрэбнага кантролю з боку кафедры сістэматыкі раслін не было. Прышла зіма і аб садзе забыліся. Вясной да яго таксама рукі не дайшлі. Зараз гэты ўчастак прадстауляе сабой закінутае і заросшае травой поле. Многія дрэвы і кустарнікі загінулі. Некаторыя паломаны жывёлай, таму што участак не агароджан, пасярод саду утвараюся аураг.

Калі у загадчыка кафедры сістэматыкі раслін запыталі, якія работы праводзіць кафедра на станцыі, апошні адказаu:

— Нам няма чаго там рабіць, а што і ёсць, то носіць эпізадычны характар.

Зразумела, адмахнуцца лягчэй. Арганізаваць справу, выправіць памылкі — значна цяжэй. Пара спытаць у прафесара Н. А. Дарожкіна: хто-ж павінен адказваць за запушчаны батанічны сад і чаму тав. Дарожкін вельмі рэдкі госць у Чырвоным Урочышчы?

Было-б няправільным адносіць віну за непарадкі на станцыі на работнікаu факультэта, якія там працуюць. Большасць біёлагаu добрасумленна адносяцца да сваіх абавязкаu, праяуляюць сапраўдную упартасць у арганізацыі эксперыментаu і ўжо правялі рад каштоўных назіранняу. Гэта дацэнты Палілау, Калішэвіч, аспіранткі Лабоцкая, Смірнова і Гулецкая, студэнткі Аляхновіч, Асташэвіч і многія іншыя.

Але не атрымоуваючы дапамогі з боку адміністрацыі універсітэта, дэканата, прадстауленыя самі сабе, яны працуюць у адзіночку, як кустары, з дапатопным інвентаром і не расстаюцца з надзеяй, што іх станцыя, нарэшце, стане сапраўднай навуковай базай, а рутына і кустаршчына, бяздушша і фармалізм будуць пераадолены.

Хутчэй-бы наступіў гэты час!

А. АЛЯКСЕЕЎ.

Партыйнае жыццё

ДОБРАЕ ПАЧЫНАННЕ

Партыйнае бюро юрыдычнага факультэта у гэтым навучальным годзе стала практыкаваць заслухванне на сваіх паседжаннях справаздач комуністау аб іх рабоце. Пры гэтым партбюро кіравалася жаданнем узмацніць сувязь з комуністамі, палепшыць кантроль за выкананнем імі сваіх службовых і партыйных абавязкаў і аказаць адпаведную дапамогу тым, хто у ёй мае патрэбу.

На паседжанне выклікаліся адзін-два комуністы. Такім чынам, на трох паседжаннях былі абмеркаваны справаздачы пяці комуністау-студэнтау (Серафімовіч, Лімантау, Рудзік, Андрэенка, Клементовіч). На партбюро выклікался не толькі таварышы, якія адстаюць у вучобе, слаба удзельнічаюць у грамадскім жыцці, але і тыя, якія добра паспяваюць і з'яуляюцца актывістамі.

Заслухоуванне справаздач старанна рыхтавалася. Напярэдадні член партбюро тав. Мельцэр, адказны за вучэбна-выхаваучую работу, гутарыу з комуністамі, цікавіуся, як студэнты вучацца, якія у іх цяжкасці, як адносяцца таварыши да выканання сваіх партыйных даручэнняу. Тав. Мельцэр гутарыу і з выкладчыкам, замацаваным за студэнцкай групай, у якой займаецца даны таварыш. Галоунай мэтай гэтых гутарак было выяуленне таго, у якой дапамозе мае патрэбу комуніст.

У тым-жа напрамку вялося і абмеркаванне справаздач на паседжаннях партыйнага бюро. Яно праходзіла у дзелавой таварыскай абстаноуцы. Выступаючыя таварышы давалі падрабязную канкрэтную характарыстыку комуніста, яго станоучых і адмоуных рыс. раілі, як ліквідаваць недахопы. На бюро комуністы адчувалі, што іх выклікалі не для «пакачкі», не для «пратакола», а для аказання дапамогі.

Так, напрыклад, таварышу Андрэенка па просьбе партыйнага бюро прадстаулен інтэрнат. Т. т. Клементовічу, Лімантаву было указана на іх недастатковую працу у групе, дзе яны як комуністы павінны дапамагаць выкладчыкам і грамадскім арганізацыям у павышэнні паспяховасці і вучэбнай дысцыпліны. Комуністу Рудзіку было указана на неабходнасць павысіць сваю паспяховасць.

Пры абмеркаванні справаздачы тав. Серафімовіча, выдатніка і актывіста, высветлілася, што ён перагружан пастаяннымі даручэннямі і гэта перашкаджае яму працаваць над сабой. Партыйнае бюро рашыла вызваліць тав. Серафімовіча ад часткі грамадскіх даручэнняу.

Партыйнае бюро арганізавала праверку выканання сваіх рашэнняу па справаздачах указаных таварышоу. Першыя вынікі паказваюць, што абмеркаванне справаздач прынесла вялікую карысць. Комуністы сталі лепш вучыцца, уздзяляць больш увагі грамадскай рабоце.

У наступным годзе партыйнае бюро факультэта намерана практыкаваць абмеркаванне справаздач комуністау-выкладчыкау і студэнтау.

М. ПЯТРОУ.

Завочнікі перад экзаменам. Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.

На царністым шляху навукі

Калі Яня выйшла у апошні раз з кабінета дырэктара, яна адчула: прыйшоу час рашыць, што рабіць далей.

Некаторыя настаупікі раілі узяцца за медыцыну. «Гэта жаночая спецыяльнасць, цікавая і высокародная»,—гаварылі яны.

Яня была на раздарожжы. Жыццёвага вопыту яна не мела. Дзяучына пачала больш пільна прыглядацца да сябе. І лавіла сябе на тым, што яе больш за усё цягне да прыродазнаустваі асабліва да фізікі і матэматыкі.

Чым больш цяжкай была задача, тым больш упарта и настойліва дабівалася Яня яе рашэння. І тады дзяучына зразумела, што толькі фізіка і матэматыка змогуць захапіць яе. Гэта і вырашыла выбар.

Яніна Хвашчэуская падала заяву на фізіка-матэматычны факультэт нашага універсітэта. І хутка яна зазначыла, што не памылілася. Вучоба ва універсітэце штодзень адкрывала перад дзяучынай усё новыя і новыя гарызонты і тайны навукі, складаныя тэарэмы і законы, аб якіх раней яна і не здагадвалася. Яніна імкнулася усё схапіць, не упусціць ніводнага цікавага моманту. Яна актыуна удзельнічала у рабоце семінарау і калоквіумау.

Курс атамнай спектраскапіі, які чытау прафесар Б. І. Сцяпанау, прыводзіу Яніну у захапленне. Вялікая будучыня, якая павінна адкрыцца з выкарыстаннем энергіі, заключанай у атамных ядрах, клікала дзяучыну, будзіла яе думкі, акрыляла марамі.

Але не толькі мары былі уласцівы студэнтцы Хвашчэускай. Вельмі часта гэту бялявую дзяучыну, нагадваючую больш за усё шуструю дзесяцікласніцу, можна было бачыць у лабараторыях каля інфрачырвонага спектрометра. І гэта у той час, калі усе супрацоунікі ужо адпачывалі дома.

Першы раз з спектрометрам Яніна пазнаёмілася у Ленінградзе, на заводзе, дзе ён вырабляецца. У лабараторыі студэнтка грунтоуна вывучыла яго. Безліч фотаплёнак праявіла яна. І у гэтыя хвілины дыпломніца не зауважыла, што рабілася навокал. Яна з галавой акунулася у малекулярны свет, імкнучыся глыбей зазірнуць у яго тайны.

Рэдкая дапытлівасць, настойлівасць і страсць да эксперыментау не магли быць не зауважанымі вучонымі факультэта. І размеркавальная камісія рэкамендавала Яніну Хвашчэускую у аспірантуру.

Тэмай сваей дысертацыі маладая аспірантка абрала праблемы, звязаныя з малекулярным аналізам у інфрачырвонай вобласці. Тэма называецца «Методыка работы на інфрачырвоных спектрометрах».

Нягледзячы на тое, што у першы год вучобы прадстаяла здаваць кандыдацкі мінімум па філасофіі і замежнай мове, Яніна не забывала і пра лабараторыю. Вынікам доследау з'явіуся артыкул у «Вучоных записках» універсітэта «Паглыбленне адмоунага патоку радыяцыі». Акрамя таго, сумесна з намеснікам дырэктара інстытута фізікі АН БССР тав. Барысевічам і студэнткай Лапцевіч аспірантка Хвашчэуская выступіла у часопісе «Труды інстытута фізікі і матэматыкі за 1956 год» з артыкулам «Дысперсіённыя фільтры для інфрачырвонай вобласці».

Зараз Яніна Хвашчэуская працуе у добра абсталяванай спецыяльнай лабараторыі пад кіраунщтвам прафесара Б. І. Сцяпанава. На апошняй навуковай сесіі універсітэта паведамленне Хвашчэускай аб сваіх доследах атрымала станоучую ацэнку вучоных.

Яніна Хвашчэуская знайшла свае сапраўднае прызванне, свой жыццёвы шлях. Гэта шлях навукі—цяжкі, цікавы і высокародны. І першыя яе крокі па гэтаму шляху паказваюць, што у навуку ідзе смелы даследчык.

Л. КЛАДНІЦКАЯ.

Вынікі дзяржаўных экзаменаў па гісторыі КПСС

Днямі партыйны камітэт універсітэта абмеркаваў пытанне аб выніках дзяржаўных экзаменаў па гісторыі КПСС у 1957 годзе. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў намеснік загадчыка кафедры гісторыі КПСС дацэнт В. М. Сікорскі.

Ніжэй змяшчаецца скарочаны гэкст даклада.

* * *

Старанны аналіз вынікаў дзяржаўных экзаменаў па гісторыі КПСС дае магчымасць выявіць і выправіць не толькі многія недахопы у вучэбнай рабоце кафедры гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі, але і многія недахопы нашай палітыка-выхаваучай работы. Таму, безумоўна, карысна і неабходна вывучаць і абмяркоуваць вынікі дзяржаўных экзаменаў па грамадскіх навуках не толькі на кафедрах, але і у партыйных арганізацыях.

Дзяржаўныя экзамены па гісторыі КПСС у 1957 годзе усяго ва універсітэце трымала 711 чалавек. Агульныя вынікі па адзнаках ведау наступныя: «выдатна» атрымалі 172 студэнты, або 24,2 працэнта, «добра»—305 студэнтаў, або 42,9 працэнта, «здавальняюча» — 219 студэнтаў, або 30,8 працэнта. Нездавальняючыя адзнакі атрымала 15 чалавек, або 2,1 працэнта. Такім чынам, большасць выпускнікоу (67,1 працэнта) выявілі выдатныя і добрыя веды.

У цэлым узровень ведаў студэнтаў-выпускнікоу у гэтым годзе некалькі вышэй мінулага года. Гэта тлумачыцца павышэннем патрабаванняу з боку экзаменатараў. Адзначаюцца больш глыбокія веды выпускнікамі творау В. І. Леніна, рашэнняу з'езду, канферэнцый партыі, Пленумау ЦК. Менш стала начотніцтва. На усіх факультэтах адзначаліся значныя групы выпускнікоу, паказаўшых уменне звязваць тэарэтычныя палажэнні з сучасным жыццём, з практыкай комуністычнага будаунщтва. У ліку іх: Герасіменка, Салашэнка (гістфак), Галышава, Бычкова (хімфак), Букіна, Хоміч, Карпава (геафак), Іваноуская, Клімепцепка, Нікіфаровіч, Кісялёва (філфак), Зюліна, Хадарэнка, Хох, Кардаш (біяфак), Зяцькоу (фізмат) і многія іншыя.

Лепшыя вынікі дзяржаўных экзаменаў—на фізіка-матэматычным факультэце, дзе каля 40 працэнтау выпускнікоу атрымалі выдатныя адзнакі і столькі-ж — добрыя. Менш уцяшальныя вынікі дзяржэкзаменаў па гісторыі КПСС на гістарычным факультэце, дзе 42 працэнты выпускнікоу атрымалі здавальняючыя адзнакі, і больш 4 працэнтаў — нездаваль няючыя, а таксама на геафаке. Амаль на усіх факультэтах — выключаючы толькі аддзяленне журналістыкі — адзначана больш слабая падрыхтоука выпускнікоу-завочнікау.

Дзяржаўныя экзамены па гісторыі КПСС выявілі і ускрылі рад істотных прабелаў у грамадскай падрыхтоуцы і выхаванні студэнтаў. На усіх факультэтах мелася даволі значная колькасць выпускнікоу, якія выявілі павярхоўныя веды. Гэта Баранау, Шацкая (фізмат), Стауская, Сцяпанава (хімфак), Лысак, Макарэвіч, Салдаткіна, Лабус (філфак), Арцішкевіч (гістфак) і некаторыя іншыя. Студэнтка Лабус, напрыклад, не змагла растлумачыць, чаму у Вярхоуным Совеце СССР дзве палаты і як яны выбіраюцца. Студэнтка Арцішкевіч не змагла адказаць, калі у Расіі быу звергнут царызм.

Першы і важнейшы вывад. да якога прыйшла кафедра, абмяркоуваючы вынікі дзяржэкзаменаў, — гэта неабходнасць далейшай барацьбы за павышэнне якасці выкладання, за рашучае пераадоленне элементау начотніцтва і дагматызму у вучэбнай рабоце грамадскіх кафедр.

Вынікі дзяржаўных экзаменаў гавораць таксама аб неабходнасці рашучага паляпшэння палітыка-выхаваучай работы з боку кафедр грамадскіх навук і партыйных арганізацый. Трэба прызнаць ненармальным, што выкладчыкі грамадскіх навук часта стаяць у баку ад палітыка-выхаваучай работы са студэнтамі. На кафедры гісторыі КПСС уносіліся прапановы аб тым, каб выкладчыкі грамадскіх навук, якія вядуць семінарскія заняткі, больш цікавілся пытаннямі бягучай палітыкі, патрабавалі ад студэнтаў ведання важнейшых падзей міжнароднага жыцця. Неабходна наладзіць больш цесны кантакт выхавацелей, якія замацаваны да груп, з выкладчыкамі, якія вядуць у гэтых групах семінары па грамадскіх навуках.

Падводзячы вынікі дзяржэкзаменаў па гісторыі КПСС, быу зроблены вывад аб неабходнасці сур'ёзнага павышэння патрэбавання да студэнтау на перавадных экзаменах.

У гэтай сувязі выказваліся пажаданні, каб дэканаты аказвалі падтрымку выкладчыкам і не прысылалі студэнтаў, якія не здалі экзаменаў, па 2—3 разы на пераздачу.

У далейшым было-б мэтазгодна абмяркоуваць вынікі дзяржэкзаменаў па гісторыі КПСС у больш шырокай аудыторыі — напрыклад, на вучоным совеце гуманітарных навук, або на аб'яднаным паседжанні кафедр грамадскіх навук.

Явы вучыліся ў нашым універсітэце

АД ПОСПЕХА ДА ПОСПЕХА

Першы раз Нікалай Іванавіч Чарняускі адчуу сябе сапраудным настаунікам вясной 1951 года, калі ён быу яшчэ студэнтам 5 курса філалагічнага факультэта. Настаунік беларускай мовы і літаратуры 42 Мінскай школы пераходзіу на іншую працу, і Нікалаю Іванавічу далі два пятых класы. Акрамя выкладання беларускай мовы і літаратуры, ён быу прызначаны класным кіраўніком у 5 «Б». Практыкі у Нікалая Іванавіча, вядома, было мала, але ён прыкладау усе намаганні, каб набыць яе. У вольны ад урокаў і працы час ён хадзіу на урокі старэйшых таварышаў, аналізаваў іх, звяртауся да спрактыкаваных настаўнікаў за дапамогай, парадамі. У выніку 5 «Б», які лічыуся самым цяжкім сярод пятых класаў, стау падцягвацца. У класе было праведзена многа захапляючых гутарак, піонерскіх зборау, арганізаваны цікавыя паходы. Так, напрыклад, вельмі глыбокае уражанне у дзяцей засталося пасля экскурсіі. Так, разам з жонкай Янкі Купалы Уладзіславай Францаунай Луцэвіч піонеры наведалі радзіму Янкі Купалы—вёску Вязынку.

Нарэшце, атрыман дыплом, і Нікалай Іванавіч Чарняускі накіроуваецца на работу у школу, якая ужо стала для яго роднай. Ён працягвае выкладаць у пятых класах, як і раней, і працуе класным кіраўніком у адным з іх.

Акрамя работы завуча, Нікалай Іванавіч вядзе урокі беларускай мовы і літаратуры у дзесятых класах і не расстаецца з пятым класам, які ён жадае давесці да дзесятага.

Для таго, каб яшчэ больш узбагаціць свой вопыт і тэарэтычныя веды, Нікалай Іванавіч у гэтым годзе паступіу на Рэспубліканскія курсы павышэння кваліфікацыі завучау, дзе ён вучыцца без адрыву ад працы. У школе любяць і паважаюць Нікалая Іванавіча Чарняускага.

Не забывае Нікалай Іванавіч сваіх універсітэцкіх сяброу і любімых выкладчыкаў. З асаблівай любоўю ён успамінае Нікалая Іванавіча Жыркевіча, які навучыу яго любіць беларускую літаратуру, глыбока разумець яе.

На пытанне, чаго-б ён пажадау нашым выпускнікам, Нікалай Іванавіч адказаў, што, перш за усё, вядома, любіць сваю прафесію, свой прадмет і дзяцей. Маладым настаўнікам ён-бы параіу пачынаць свой працоуны шлях з пятых класаў, а не старацца атрымаць урокі адразу у дзесятых класах. І яшчэ—кожны настаунік павінен мець уласную бібліятэку як мастацкай, так і метадычнай літаратуры. Таму выпускнікі ужо цяпер павінны паклапаціцца аб гэтым.

І. ГАЛЕЙ.

КАБ ДАЦЬ ДОБРЫ УРОК

— Трыццаць год прайшло з таго часу, калі я, закончыушы гістарычны факультэт універсітэта, была накіравана на працу у Жлобінскую школу выкладчыцай гісторыі і геаграфіі,—успамінае завуч школы № 1 горада Мінска А. В. Скалуба.—Гэта быу толькі другі выпуск Беларускага універсітэта. Як вядома, не абыйшлося без цяжкасцей. Працаваць прыходзілася вельмі многа, каб як мага лепш, прасцей падаць вучням неабходны матэрыял. Асаблива запомніуся мне урок па гісторыі у 9-ым класе. Тэмай урока была «Вялікая французская рэволюцыя». Як мне здавалася, матэрыял я ведала добра, пагэтаму да урока сур'ёзна не рыхтавалася, крыху прагледзела матэрыял і пайшла у школу. Вучням сваім я расказала аб становішчы Францыі напярэдадні рэволюцыі, аб ходзе класавай барацьбы. Закончыушы тлумачэнне, паглядзела на гадзіннік і здзівілася: да канца урока засталося 15 мінут. Я не ведала, што рабіць і пачала апытанне па геаграфіі.

— З таго часу—прадаужае А. В. Скалуба, — прайшло ужо 30 год, але гэты урок я запомніла на усё жыццё. Ён навучыу мяне заусёды ісці у клас добра падрыхтаванай.

Каб даць добры ўрок, настаўнік не павінен баяцца чарнавой працы, не павінен сароміцца запытацца у старэйшых таварышаў, як лепш пабудаваць урок, абмеркаваць яго.

Будучым настаўнікам, якія заканчваюць універсітэт, хочацца пажадаць ўсёй душой палюбіць сваю прафесію і дзяцей—нашу змену. Толькі з любоўю у сэрцы да маладога пакалення, з высокім усведамленнем свайго грамадзянскага абавязку быць яго выхавацелем, магчыма дабіцца поспеху на цяжкім і пачэсным шляху на стаўніка.

Л. ЛУКАШОНАК.

ВОПЫТ СЕЛЬСКАЙ НАСТАЎНІЦЫ

Памятны традыцыйны вечар сустрэчы студэнтау філалагічнага факультэта з яго выпускнікамі.

Выступае сельская настаунiца Вікторыя Іванаука Садчанка. Яна выкладае рускую мову і літаратуру у Брагінскім раённым цэнтры Гомельскай вобласці. Нямнога яшчэ працавала т. Садчанка, але ужо мае значны вопыт работы ў сельскай школе.

— Не толькі веды патрэбны настаўніку, — гаворыць В. І. Садчанка,—ён павінен любіць сваю справу, творча адносіцца да яе. Пры гэтых умовах і выпрацоуваецца методыка выкладання. Яе нельга вывучыць па кнігах і ужываць пры усіх выпадках жыцця, як думаюць некаторыя. Прычым, зусім неабавязкова, каб гэта методыка была аднолькавай для усіх настаўнікаў. Наадварот, наша школа імкнецца да рознастайных метадау работы з вучнямі.

Хочацца параіць маладым выкладчыкам пачынаць працу з вучнямі пятых-шостых класау. Тады у старэйшых класах яны убачаць вынікі сваей працы. Ім не давядзецца па каго-небудзь наракаць за непісьменнасць вучняу. Такі метад працы дапаможа значна павысіць паспяховасць. Для гэтайжа мэты трэба наладзіць узаемаведанні настаўнікамі ўрокаў у пачатковых, сярэдніх і старэйшых класах. Падобны абмен вопытам яшчэ не ўкараніўся у практыцы нашых школ. Гэта ўскладняе працу выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры у старэйшых класах. Выкладчыку бывае вельмі цяжка выкрыць, а затым і выправіць тое, што было недапрацавана у малодшых класах. Часта даводзіцца пачынаць з азоў, напрыклад, вучыць правільнай пастаноуцы націску.

Трэба узяць сабе за правіла, што нельга пачынаць новы матэрыял, не пераканаўшыся ў тым, што ранейшы вучні засвоілі добра

Бывае так, што настаунікі не турбуюць на уроках вучняў, якіх яны лічаць слабымі. Яны тлумачаць гэта тым, што такія вучні забіраюць многа часу. Для таго, каб не губляць часу, трэба знаходзіць іншыя спосабы для іх апытання. Напрыклад, можна даць ім на ўроку самастойную работу, а пасля праверыць яе.

Яшчэ можна параіць будучым сельскім выкладчыкам запасацца падручнікамі, тэкстамі, табліцамі, таму што, на жаль, бібліятэкі пры большасці сельскіх школ вельмі бедныя і бывае цяжка даставаць неабходную літаратуру.

Кожны настаўнік жадае заслужыць любоу і павагу сваіх вучняу. Выкладчык мовы і літаратуры мае ў гэтых адносінах тую перавагу перад іншымі, што мова і літаратура — любімыя навучальныя прадметы.

Н. ЛЕЎДАНСКАЯ.

Што будзе на фестывалі ў Маскве

СЕМІНАР І ВУЧЭБНАЯ ПАЕЗДКА СТУДЭНТАЎ ТЭХНІЧНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ

Лекцыі па актуальных пытаннях энергетыкі, наведванне Маскоўскага энергетычнага інстытута, агляд лінін высоковольтных перадач і іншых энергетычных збудаванняў.

Семінар па пытаннях мірнага выкарыстання атамнай энергіі.

Папулярныя лекцыі буйнейшых спецыялістаў у галіне мірнага выкарыстання атамнай энергіі, наведванне павільёна мірнага выкарыстання атамнай энергіі Усесаюзнай прамысловай выстаукі і другіх месц, якія звязаны з тэмай семінара.

СЕМІНАР СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ ВЫВУЧАЮЦЬ ПРАВА

Тэма семінара—«Пытанні міжнароднага права ва Уставе ААН».

Лекцыі буйнейшых спецыялістаў па міжнароднаму праву, дыскусіі па тэме, абмен інфармацыяй па юрыдычнай адукацыі ў розных краінах, наведванне юрыдычных установ.

СЕМІНАР СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ ВЫВУЧАЮЦЬ ЛІТАРАТУРУ

Лекцыі па сучаснай літаратуры розных краін.

Выступленні відных пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў, дыскусіі па тэмах лекцый, абмен інфармацыяй аб арганізацыі літаратурнай адукацыі ў розных краінах, наведванне бібліятэкі імя В. І. Леніна, музеяў А. М. Горкага, Л. Н. Талстога, бібліятэкі—музея Маякоўскага, музея Н. Астроўскага, экскурсія ў Ясную Паляну.

СЕМІНАР СТУДЭНТАЎ, ЯКІЯ ВЫВУЧАЮЦЬ ФІЛАСОФІЮ

Тэма семінара—«Ці магчыма прадугледзець шляхі развіцця чалавечага грамадства?»

Выступленні відных філосафаў, дыскусіі па тэме семінара, абмен інфармацыяй аб вывучэнні філасофіі ў розных краінах.

МІЖНАРОДНЫЯ СУСТРЭЧЫ СТУДЭНТАЎ АДНОЛЬКАВЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

Мэта міжнародных сустрэч студэнтаў аднолькавых спецыяльнасцей — прадаставіць студэнтам магчымасць абмяняцца інфармацыяй і думкамі адносна вучэбных праграм і метадаў навучання ў розных краінах.

Будуць праведзены сустрэчы студэнтаў наступных спецыяльнасцей: медыцына, педагогіка, эканоміка, хімія, гісторыя, археалогія, выяуленчае мастацтва, геаграфія, астраномія, геалогія, біялогія, фізічнае выхаванне і спорт.

КУЛЬТУРНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ

— Вечар студэнцкіх песен розных краін.

— Вечар універсітэцкіх традыцый з паказам традыцыйных касцюмаў, студэнцкіх песень і іншых звычаяў універсітэтаў розных краін.

— Студэнцкі карнавал.

— Міжнародныя студэнцкія канцэрты з удзелам лепшых студэнцкіх мастацкіх груп з розных краін.

МІЖНАРОДНЫ СТУДЭНТКІ КЛУБ

Міжнародны студэнцкі клуб будзе пастаянным цэнтрам студэнтау—удзельнікаў Фестылю, дзе будзе праводзіцца штодзённая праграма мерапрыемстваў. Гэта будзе месца для неафіцыяльных сустрэч з магчымасцямі для адпачынку (чытальныя залы, студэнцкія кафэ, пакоі для гульні ў шахматы, залы для сяброускіх сустрэч і г. д.).

НАСТУПНЫЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ БУДУЦЬ УКЛЮЧАНЫ У ПРАГРАМУ МІЖНАРОДНАГА СТУДЭНЦКАГА СВЯТА

— Лекцыя на тэму «Міжпланетныя падарожжы».

— Дыскусія на тэму «Рэформа нацыянальнай культуры» з выступленнямі замежных і совецкіх відных дзеячоў культуры.

— Лекцыя на тэму «Студэнты і сусветная культура».

— Сустрэчы з віднымі пісьменнікамі і паэтамі розных краін.

— Дыскусія на тэму—«Універсітэт і грамадства».

— Міжнародныя студэнцкія балі.

— Сустрэча па пытаннях супрацоуніцтва студэнтау у галіне культуры і абмену сярод студэнтау аднолькавых спецыяльнасцяу.

— Сустрэча з удзельнікамі совецкай антарктычнай экспедыцыі.

— Вечар джазавай музыкі.

— Паказ студэнцкіх фільмаў удзельнікаў Фестывалю.

— Лекцыі аб жыцці студэнтау розных краін, якія прадстаулены студэнцкімі дэлегацыямі на фестывалі.

— Сустрэча рэдактараў студэнцкіх выданняў і студэнтаў, якія вывучаюць журналістыку.

— Сустрэчы паміж студэнцкімі дэлегацыямі розных краін.

— Канцэрт «Майстры мастацтва—студэнтам».

— Вечары танцаў.

— Сеанс адначасовай гульні ў шахматы на 50 дошках.

— Вечар сімфанічных мініятур у выкананні студэнцкага сімфанічнага аркестра.

— Канцэрт удзельнікаў харэаграфічных вучылішчаў.

(«Всемирные студенческие новости», № 2).

НАСУСТРАЧ СУСВЕТНАМУ СВЯТУ

Інтэрнацыянальны студэнцкі ансамбль „Фестываль"

Гэты ансамбль арганізаван у Ленінградзе. У яго складзе юнакі і дзяучаты з Інданезіі, Фінляндыі, Францыі, В'етнама, Галандыі, Балгарыі і многіх іншых краін. Яны вучацца у Совецкім Саюзе.

На рэпетыцыях можна ўбачыць і прафесара Джакартскага універсітэта Усмана Эфендзі. «Я, — гаворыць вучоны, — спяваю за сваю дачку, паколькі яна яшчэ не прыехала».

Салісты, хор, аркестр і танцавальны калектыў ансамбля выратавалі падрыхтаваць да Маскоўскага фестывалю цікавую праграму—«Дзве гадзіны падарожжа вакол свету». Ансамбль заняты не толькі рэпетыцыямі. Студэнты часта праводзяць вечары, прысвечаныя розным краінам—радзіме то аднаго, то другога ўдзельніка. Да такіх вечароу рыхтуюцца выстаўкі кніг, часопісау, афармляюцца фотавітрыны.

Яшчэ некалькі месяцаў назад незнаёмыя людзі, члены ансамбля, зрабіліся вялікімі сябрамі. А нядаўна яны нават урачыста адсвяткавалі вяселле двух сваіх таварышоў.

ПАДАРУНАК СЯБРАМ

Як вядома, у Совецкім Саюзе будуецца першы у свеце атамны ледакол. Але вось аб другім яшчэ мала хто ведае. Праўда, гэты «атамны» ледакол будзе раз у сто менш першага, ды і месца для вялікага рэактара на ім не запланавана. Рухаць «карабль» будзе не атамная энергія, а радыёсігналы, якія пасылаюцца на мадэль з берага пруда.

Затое ва усім астатнім мадэль будзе вельмі падобна на атамны ледакол, які будуецца. Такой-жа будзе форма корпуса і надбудоў. Таксама паслухмяна судна будзе выконваць каманды.

Будаўнікі другога «атамнага» ледакола—вучні тэхнічнага вучылішча № 5 і члены судабудаўнічага гуртка пры Доме культуры працоўных рэзерваў Ленінграда—пашлюць яго ў якасці падарунка у Маскву на VI Сусветны фестываль.

НА УЛАСНАЙ ЯХЦЕ

Студэнты Куйбышэўскага авіяцыйнага інстытута вырашылі прыехаць у Маскву на Фестываль не поездам або самалётам, а на уласнай яхце. Яшчэ ў мінулым годзе нарадзілася гэтая думка—пабудаваць да фестывалю вялікую яхту і па Волзе адправіцца на ёй у сталіцу. У канцы чэрвеня гэта яхта, самая вялікая на рацэ, будзе спушчана на ваду.

«Молодежь мира» № 2)

У родной школе

Апошні экзамен! Нават не верыцца, што ты не будзеш тут у наступным годзе, а тваё месца ля акна у адным з кабінетаў зойме прыйшоушы на змену першакурснік. Хочацца назаўсёды захаваць у памяці усё тое, што стала такім родным і блізкім за пяць студэнцкіх год.

Такі настрой авалодау Зінай, калі яна развітвалася з універсітэтам.

Але штосьці клікала туды, дзе прадстаяла зрабіць першыя самастойныя крокі. Ва універсітэце выпускныя экзамены здадзены на «выдатна».

Зіну Солтан, выпускніцу мінулага года, накіравалі у Клічаўскую сярэднюю школу выкладчыцай рускай мовы і літаратуры. Гэтая школа добра знаёма ёй. Пяць год назад яна скончыла Клічаўскую СШ са срэбраным медалем. Многія з настаунікаў, якія раней вучыл Зіну, працуюць у школе і зараз. З радасцю прынялі яны былую вучаніцу ў свой настаўніцкі калектыу.

Тэмай першага урока была грамадска-палітычная літаратурная барацьба 30—40 гадоу.

—Не ведаю,—кажа Зіна,—ці ўдалося мне зацікавіць клас, толькі на працягу урока вучні не праяуляли звычайнай нервознасці, а калі празвінеў званок на перапынак, ніхто не зварухнуўся.

Аднак разам з поспехамі па літаратуры прыйшлі няўдачы па мове. У першым дыктанце некаторыя дзевяцікласнікі зрабілі па 30 памылак. Зіна зразумела, што адной-двума гадзінамі ў тыдзень пры такім становішчы нельга абмяжоувацца. Прыходзілася працаваць дадаткова, цярпліва...

— Мне чамусьці думался,—гаворыць Зіна Солтан у канцы гуткі,—што другіх вучыць значна лягчэй, чым вучыцца самой. Аказалася наадварот.Але калі любіш сваю прафесію, першыя цяжкасці не толькі не палохаюць, а нават натхняюць у далейшай рабоце.

П. КАЗАЧОНАК.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

„Навуковая прадукцыя" дацэнта Акінчыца

Пад такім загалоўкам у № 8 нашай газеты быў змешчаны артыкул, у якім крытыкавалася «навуковая» дзейнасць дацэнта Акінчыца. Сакратар партыйнага бюро геолага-геаграфічнага факультэта паведаміў рэдакцыі, што артыкул быў абмеркаван на паседжанні бюро. Факты, прыведзеныя ў артыкуле, правільныя. Партыйнае бюро ўказала тав. Акінчыцу на несур'ёзныя адносіны да справы і патрабавала ад яго карэннага паляпшэння вучэбнай і навуковай работы.

Дэкану факультэта О. Н. Андрушчанка і загадчыку кафедрай Н. Т. Раманоўскаму прапанавана патрабаваць ад А. С. Акінчыца старанней падрыхтоўкі да кожнай лекцыі і выканання плана навуковай работы. Адначасова партыйнае бюро ўказала тав. Рагозіну на неабходнасць больш сур'ёзна адносіцца да рэцэнзіравання навуковых прац.

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19 Рэдактар А. ВОЛК.

АТ 01552 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 741. Тыраж 2000